# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА М. А. ЖУРЫНСКАЙ



**М. А. Журынская, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

сакавік 1942 г. – лістапад 1943 г.

**Месца дзеяння:**

хлебазавод № 1 г. Віцебска

**Колькасць:**

10 чалавек

**Кіраўнікі:**

Журынская Марыя

Дзейнічала на віцебскім хлебазаводзе № 1 з сакавіка 1942 г. да лістапада 1943 г. Налічвала 10 чалавек. Кіраўнік М. А. Журынская. Калі акупанты аднавілі хлебазавод для патрэб арміі, па заданні камуніста І. А. Бекішава камсамолка М. А. Журынская (да вайны студэнтка медінстытута) стварыла на прадпрыемстве падпольную групу.

У яе ўвайшлі сёстры Журынскай Ала (Адміралава) і Ада (Дамарацкая), маці Алёна Іванаўна, камсамолка Г. В. Касюбайціс (Шапо), маці і дачка Грынявіцкія, піянерка Люба Марозава (Мурашка), а таксама ваеннапалонныя П. А. Жукаў і У. М. Ануфрыеў, якія працавалі на хлебазаводзе.

Патрыёты разладжвалі абсталяванне, учынялі пажары, выносілі і вывозілі гатовую прадукцыю. Па нумарах і ўмоўных знаках, што змяшчаліся на аўтамашынах, якія прыбывалі на завод, па аб’ёме выдаткаванага хлеба і дакументах вызначалі колькасць асабовага складу, назву і месца дыслакацыі вайсковых часцей. Хутка група Журынскай наладзіла стасункі з возчыкамі хлеба ваеннапалоннымі І. Сідзельнікавым і Ф. Нікалаевым. Амаль штодзённа сёстры Журынскія разам з І. Грынявіцкай хавалі ў тайнікі пад сядзеннем па некалькі буханак хлеба для ваеннапалонных. Марыя Журынская па падробленых талонах арганізавала адпраўку хлеба партызанам (зімой 1942–1943 гг. было вывезена 850 кг). Жукаў і Ануфрыеў дапамагалі ў зборы разведінфармацыі. З узламанага ваеннага склада яны выкралі вялікую колькасць вінтовак і боепрыпасаў, якімі былі забяспечаны дзясяткі ваеннапалонных, якіх вывезлі ў партызанскія атрады.

У жніўні 1943 г. П. Жукаў і У. Ануфрыеў, якія папалі пад падазрэнне, былі перапраўлены да партызан. У кастрычніку 1943 г. усе астатнія члены групы арганізавана пакінулі горад. Кіраўнік групы М. А. Журынская памерла ад смяротнага ранення асколкам міны, не вярнулася з разведкі Іда Грынявіцкая.

Сёстры М. і А. Журынскія і Г. Касюбайціс узнагароджаны медалямі «За адвагу».

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група М. А. Журынскай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 485.

2. **Подпольная** группа Журинской М. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 287.